# МАЦАВАЦЬ ШЭРАГІ 3-Й ЗЬМЕНЫ

## Вывучайце слаўны шлях барацьбы бальшавікоў за соцыялізм

3-му пакаленьню бальшавікоў — важаку мас дзетвары, юным ленінцам 10 гадовага юбілею — баявое прывітаньне ад бальшавікоў Беларусі.

Вам, дзецям пролетараў і колгасьнікаў, пераможна будуючым соцыялізм пад кіраўніцтвам партыі Леніна, прыдзецца канчаткова ўстанавіць комуністычнае грамадзтва.

Вы носіце імя Уладзімера Ільліча Леніна.

Вывучайце-ж слаўны шлях барацьбы бальшавікоў за соцыялізм, выкоўваючы з сябе дастойную, здаровую зьмену комсамолу і партыі.

Дні свайго слаўнага юбілею скарыстайце для яшчэ большага гартаваньня сваіх радоў, змагайцеся за якасьць вучобы, за сьвядомую дысцыпліну, за соцыялістычныя адносіны да працы і вучобы, за сапраўднае правядзеньне пастаноў ЦК аб школе, за інтэрнацыянальна-клясавае выхаваньне дзяцей усіх нацыянальнасьцяй.

Няхай жыве дзіцячая комуністычная організацыя юных піонэраў імя Уладзімера Ільліча Леніна.

Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр т. Сталін.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО